# СЕКЦИЯ I
# МЕСТО И РОЛЬ БЕЛАРУСИ В ИСТОРИЧЕСКОМ И ГЕОПОЛИТИЧЕСКОМ ПРОЦЕССАХ. ПРАВОВОЕ РЕГУЛИРОВАНИЕ МЕЖДУНАРОДНОГО ГУМАНИТАРНОГО И СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОГО СОТРУДНИЧЕСТВА

## ЧАПЛІНСКАЕ ГАРАДЗІШЧА

**Д. В. Загорцаў**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік д-р гіст. навук, праф. С. А. Елізараў

У сівых стагоддзях старажытнасці губляецца гісторыя Страдубшчыны. Гераічная і хвалюючая гісторыя гэтага краю звязана з гісторыяй усходніх славян, з гісторыяй Старажытнай Русі.

Археалагічныя раскопкі выявілі на тэрыторыі сучаснай Страдубшчыны стаянку старажытнага чалавека, якая адносіцца да перыяду неаліту, ці позняга мезаліту. Гэта Рэкор-даўская стаянка; датуецца прыкладна V–IV тысячагоддзямі да н. э.

З цягам часу ідзе больш поўнае засяленне тэрыторыі, а звязана гэта з тым, што найбольш ўрадлівыя ўчасткі зямлі меліся на правобережье Дняпра ад Рэчыцы да Лоева, дзе найбольш цесна сканцэнтраваны помнікі мілаградскай культуры. Больш плотнае засяленне адбываецца тады, калі чалавек пачынае ў сваёй гаспадарчай дзейнасці выкарыстоўваць металы, і ў сувязі з гэтым атрымоўваюць лепшыя вынікі. Шматгадовыя даследаванні Чаплінскіх археалагічных помнікаў прывялі да таго, што яны сталі самымі вялікімі помнікамі ранняга веку металаў на тэрыторыі Беларусі [1].

На Беларусі жалезны век пачаўся ў VII–VI ст. да н. э., калі мясцовыя плямёны навучыліся здабываць жалеза і вырабляць з яго прылады, зброю, упрыгожванні. Жалеза тут выплаўлялі з балотнай руды ў невялікіх паўшарападобных печах – домніцах. З вынаходніцтвам жалеза галоўным заняткам старажытых плямён станавілася ляднае (падсечнае) земляробсва, а з яго развіццем павысілася гаспадарчае значэнне жывелагадоўлі. Паляванне, рыбалоўства і збральніцтва паступова ператвараліся ў дапаможны занятак. Развівалася рамяство – апрацоўка дрэва і косці, бронзаліцейная справа, прадзіва, ткацтва, пляценне, ганчарства. Людзі пачалі будаваць больш складаныя жылыя і гаспадарчыя пабудовы [2].

У II ст. да н. э. уся Паўднёвая і значная частка Усходняй Беларусі ўвайшла ў сферу распаўсюджвання помнікаў зарубінецкай культуры, названай так па безкурганнаму магільніку ў с. Зарубінцы на Кіеўшчыне, упершыню раскапанаму і вывучанаму украінскім археолагам В. В. Хвойкай у 1899 г. Тэрытарыяльна культура ахоплівае ўсе Парэчча Прыпяці і яе прытокаў, верхняе і сярэдняе Падняпроўе ў межах значнай часткі Смаленскай, Магілёўскай, Гомельскай і Кіеўскай абласцей, басейны Сейма і Дзясны. Вядома звыш ста помнікаў зарубінецкай культуры – селішчаў і могільнікаў, але даследаваны пакуль нешматлікія, хоць сама культура ўяўляе выключны інтарэс з пункту гледжання славянскай праблематыкі [3].

Зарубінецкая культура прыцягвае ўвагу даследчыкаў у сувязі з яе загадкавай роляй у этнічай гісторыі насельніцтва Усходняй Еўропы. Некаторыя даследчыкі лічуць зарубінецкія плямены продкамі славянскага насельніцтва Падняпроўя, другія – пляменамі з асобным дыялектам, які займалі прамежкавае становішча паміж славянскай мовай і блізкімі да яго заходнебалцкімі гаворкамі. Існуе думка, што зарубінецкая культура мае агульныя рысы з культурай згаданых антычнымі аўтарамі бастарнаў – прышэльцамі, якія нагадваюць часткова галаў, часткова германцаў [4, с. 26–27].

Надзвычай важным помнікам зарубінецкай культуры з'яуляецца археалагічны комплекс, які размешчаны каля в. Чаплін Лоеўскага раёна. Датуецца VII–VI ст. да н. э. – II ст. н. э. Чаплінскае гарадзішча знаходзіцца на мяжы паміж вёскамі Чаплін і Страдубка і таму можна смела сцвяр-джаць, што гісторыя нашай малой бацькаўшчыны мае не менш, як 2,5 тысячы гадоў [5, с. 641]. Гэты археалагічны помнік вядомы далёка за межамі Белрусі. Усяго тут было даследавана 282 пахаванні II ст. да н. э. – II ст. н. э. Найбольшы ўклад у яго даследаванне зрабіў беларускі археолаг Л. Д. Побаль, які правёў тут археалагічныя раскопкі ў 1956–1957 гг.

Старажытны ўмацваны пасёлак (гарадзішча плошчай 0,6 га) размяшчаўся на высокім беразе Дняпра. Тут пры раскопках выяўлена 21 паглыбленае ў грунт жытло. Уздоўж берага Дняпра на 90 м цягнецца неўмацаванае селішча, дзе таксама выяўлены рэшткі заглыбленных у зямлю жытлаў. Аснову сцен складалі слупы, якія вертыкальна закопваліся ў зямлю. Чатыры слупы былі па вуглах. У пазы гэтых слупоў уваходзілі канцы гарызантальна пакладзеных жэрдак. Жэрдкі ўтваралі сцены жытла. Плошча яго невялікая: 16–25 м$^2$. Пры раскопках выяўлена шмат ям, якія служылі сховішчамі, паграбамі. Яны былі авальнай формы глыбінёй 0,6–0,8 м. У гэтых ямах члены сем'яў захоўвалі свой скарб. Ў адной яме-сховішчы ляжалі жаночыя ўпрыгожванні – два бронзавыя бранзалеты, тры кроневыя кольцы, а таксама маленькі гліняны гаршчок. Невыпадкова ў ямах апынулася рыбная луска – тут хавалі запасы сушанай рыбы. Асабліва шмат пры раскопках выяўлена пустых ям. У старажытныя часы ямы маглі быць напоўнены карняплодамі. Напэўна тут хавалі рэпу, якая была вядома ва Усходняй Еўропе з вельмі старадаўніх часоў [1].

На Чаплінскім гарадішчы знойдзена шмат цікавых рэчаў. У адным месцы знойдзена пяць жалезных сярпоў. Яны па форме падобня да сучасных, але памеры іх невялікія – даўжыня 20 см.

Сапраўдным археалагічным багаццем з'яўляюцца больш за 100 гліняных прасліц. Гэта невялікія шарыкі з адтулінай пасярэдзіне. Іх надзявалі на канец верацяна, якім рабілі прадзіва. Многія прасліцы былі прыгожа арнаментаваны канцэнтрычнымі кольцамі, ямкамі, трохвугольнікамі, ромбамі, «елачкамі».

Гліняны посуд прадстаўлены трыма устойлівымі формамі: «кухоннымі» гаршкамі, у якіх варылі ежу, «сталовым посудам» – міскамі, а таксама невялікім начыненнем у выглядзе конавак з ручкамі. Увесь посуд вылеплены рукамі без прымянення ганчарнага круга.

Побач з паселішчам знахозіўся грунтовы (бескурганны) могільнік. Ёе належаў людзям, якія жылі на гарадзішчы і паселішчы. Нябожчыка спальвалі, а рэшткі, што заставаліся, зграбалі ў кучу і змяшчалі у неглыбокіх ямах. Магілы знаходзіліся раўнамерна на адлегласці 2–8 м адна ад другой. На дне ямы глыбінёй 0,5–0,7 м змяшчалі рэшткі трупаспалення. Зверху клалі упрыгожанні, прылады працы, наканечнікі коп'яў. Побач з касцямі ставілі «на той свет» гліняны посуд – гаршкі і міскі.

Чаплінскі могільнік даў шмат розных старажытных рэчаў. Яны дазволілі дакладна датаваць помнік. Сярод знаходак бронзавыя фібулы – шпількі для верхняй

вопраткі ў старажытных народаў. Вырабляліся яны з кавалка дроту. Форма фібул увесь час мянялася. Менавіта таму фібулы – важны храналагічны паказальнік помнікаў, дзе гэтыя шпількі знаходзяць [1].

Чаплінскага гарадзішча пераканаўча сведчыць аб высокім узроўні зарубінецкай культуры. Забудова гарадзішча і характар знаходак менш за ўсё адпавядаюць побыце звычайнай вялікасямейнай абшчыны. Усяго верагодней, грамадскія адносіны насельнікаў Чаплинского археалагичнага комплекса варта разглядаць як пераходныя ад патрыярхальнай вялікасямейнай абшчыны да сельскай суполцы з развіццём сямейных пачаткаў і прыкметамі маёмаснай няроўнасці.

Чаплінскі археалагічны комплекс не адзіны добра даследаваны помнік зарубінецкай культуры на тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, гэта зарубінецкі могільнік каля в. Вароніна Тураўскага раёна Гомельскай вобласці, гарадзішча «Барсучая Горка» на Магілёўшчын [3].

Аб працягу існавання вёскі сведчаць размешчаныя на месцы сучасных Чаплінскіх могілак шматлікія курганныя пахаванні перыяду Старажытнай Русі. Змешчаны яны на месцы, дзе да гэтага знаходзіліся паселішча зарубінецкай культуры, а таксама безкурганны могільнік. Знойдзены медны нацельны крыжык сведчыць аб распаўсюджванні хрысціянства. Аб значным паляпшэнні дабрабыту сведчаць знойдзеныя рэчы з серабра, у вялікай колькасці рэчы са шкла, якія сталі звычаёвымі для жанчын.

Непасрэднымі продкамі сучасных жыхароў Гомельскай вобласці з’яўляюцца ўсходнеславянскія плямёны радзімічаў і дрыгавічаў. Якраз на мяжы паміж гэтымі плямёнамі, паміж рознымі народамі і стаіць наша Страдубшчына. Аб гэтых людзях, славянах, так адзываўся візантыйскі гісторык Леў Дыякан: «Сей народ отважен до безумия, храбр и силен; они никогда живыми не сдаются неприятелям, убивают себя, чтобы в плену не служить врагу» [4].

Літаратура

1. Лоевская центральная районная библиотека: Краеведение. Памятники археологии. – Режим доступа: http://loevlib.by. – Дата доступа: 10.11.2021.
2. Жалезны век на Беларуси: Википедия. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki. – Дата доступа: 08.11.2021.
3. Загорульский, Э. М. Археология Беларуси / Э. М. Загорульский. – 2001. – Режим доступа: https://arheologija.ru/zarubinetskaya-kultura/. – Дата доступа: 14.11.2021.
4. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Лоеўскага раёна / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Минск : БелЭН, 2000. – 592 с.
5. Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 702 с.

## ОРША: ПЕРВЫЕ ЗАЛПЫ «КАТЮШИ»

**С. В. Марач**

*Учреждение образования «Гомельский государственный технический университет имени П. О. Сухого», Республика Беларусь*

Научный руководитель д-р ист. наук, проф. С. А. Елизаров

В Орше, на левобережной круче, установлен не совсем обычный памятник. Посвящен он «Катюше» – легендарной боевой машине полевой реактивной артиллерии периода Великой Отечественной войны 1941–1945 гг.